

ДОБРЫ ВЕЧАР

Добрый вечер

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА

1993 СНЕЖАНЬ 9 Чацвер

№ 233 (668)

Цана 20 рублёў

СТАЛІЧНАЯ ХРОНІКА

ПА ПАВЕДАМЛЕННЯХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ «ДВ», АГЕНЦТВАЎ РІД, БЕЛАПАН, БЕЛІНФАРМ

БЕНЗІНУ НЯМА, А ЦЭНЫ ЎСЁ РАСТУЦЬ

Вельмі дарагім задавальненнем становіцца цяпер пракаціцца з ветрам. Кожны месяц растуць цэны на гаруча-змазачныя матэрыялы, што моцна б'е па кішэні аўтааматараў. Да таго ж, шмат часу ідзе на пошукі дэфіцытнага «харчавання» для машын. Па ўсяму відаць, не прыбавіцца яго на дзяржаўных аўтазаправачных станцыях і ў апошнім месяцы адыходзячага года. Але, як паведамілі ў камітэце па нафце і хіміі пры Савеце Міністраў Беларусі, кошт паліва з 8 снежня ўзрасце ў сярэднім у 1,3 раза. Так, за літр бензіну маркі А-76 неабходна будзе заплаціць ужо 1055 рублёў, А-93 і А-92 — 1145. Па-ранейшаму ў цане будзе бензін маркі А-95. Кошт на яго ўзрасце да 1330 рублёў. Адпускаецца ён па адной цане як насельніцтву, так і прадпрыемствам. Разніца засталася толькі на дызельнае паліва. Літр яго ўладальнікам асабістага транспарту абыдзецца ў 1030, прадпрыемствам — у 880 рублёў. Натуральна, у камерцыйных структурах прыйдзецца выкласці значна больш.

Можна парадаваць толькі тых, хто карыстаецца пячным палівам і газай. Цэны на іх засталіся ранейшымі.

Як растлумачылі ў камітэце па нафце і хіміі, якому перададзены паўнамоцтвы рэгулявання кошту прадуктаў перагонкі «чорнага золата», чарговы віток цэн на іх звязаны, перш за ўсё, з падаражаннем расійскай нафты. Цяпер за адну тону яе рэспубліка будзе плаціць 450 тысяч рублёў, што на 110 тысяч больш, чым у лістападзе.

Міхаіл ЖУРАВОВІЧ.

КАНСУЛЬТАЦЫІ ПА ПРЫВАТЫЗАЦЫІ

Выканкам Свабоднага прафсаюза Беларусі прыняў рашэнне правесці ў снежні серыі кансультацый з прадстаўнікамі розных партый і рухаў, а таксама з незалежнымі спецыялістамі па пытаннях прыватызацыі ў рэспубліцы. Мэта мерапрыемства — выпрацоўка ўзважанай, усебакова абгрунтаванай пазіцыі прафсаюза ў гэтым важнейшым пытанні для максімальнай абароны інтарэсаў працоўных калектываў.

Юрый АЛЯКСЕЕЎ.

ВОПРОСЫ ЖИЗНИ И СМЕРТИ

Сегодня в Минске состоится конференция по вопросам влияния современных медицинских технологий на развитие интенсивной терапии неотложных состояний. В ее работе примут участие врачи Беларуси и зарубежных стран, в частности, Польши. Одновременно с конференцией в городской клинической больнице скорой медицинской помощи пройдет выставка современной медицинской техники.

Анатолий ВИТКОВСКИЙ.

НОВЫЙ ЛИДЕР

На чемпионате столицы Беларуси по русским шашкам за два тура до финиша вперед вышел мастер спорта Вячеслав Полянский. Он одержал победы в шестом и седьмом турах, а лидировавший до того Юрий Файнберг сыграл вничью. У В.Полянского 6 очков из 7, на пол-очка отстают Ю.Файнберг и Н. Березин. На награды продолжают претендовать также Иван Езубчик, Лев Медведь и другие участники.

ПІШУ, КАЛІ ДУША ЖАДАЕ

Персанальная выстаўка — заўсёды свята. Настаў такі радасны дзень і для пані Кусум Шукла, жонкі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Індыі ў Рэспубліцы Беларусь. 7 снежня ў Мінскім Палацы мастацтваў адкрыўся вернісаж яе мастацкіх работ, выкананых у розныя гады і ў розных краінах.

— Маляваць я пачала ў Джакарце, сталіцы Інданезіі, — успамінае пані Шукла. — Здарылася гэта ў 1977 годзе. Проста не магла не адлюстраваць у малюнку сваё захапленне казачнай прыродай гэтай краіны.

Спачатку пісаць карціны было для жонкі дыпламата звычайным хобі. Аднак з цягам часу страсць да мастацкага самавыяўлення стала для Кусум прызваннем. Пачынаючы з 1987 года пісаць карціны стала асноўным яе заняткам. У пані Шукла ўжо больш за 150 мастацкіх работ, многія з якіх былі прадстаўлены на яе выстаўках у Даніі і Катары. Частка карцін індыйскай мастачкі куплена ў прыватныя калекцыі. Але нямалая іх частка выстаўлена для знаёмства з творчасцю Кусум беларускіх аматараў жывапісу.

БАНКІРЫ ВУЧАЦЦА ЛІЧЫЦЬ

Семінар на тэму «Працэдуры фінансавання знешняга гандлю», арганізаваны сумесна Белзнешэканамбанкам і французскім банкам дэ Пары, праходзіць у гэтыя дні ў Мінску. У ім прымаюць удзел спецыялісты розных беларускіх фінансавых кампаній, асацыяцый і банкаў.

Асноўны блок пытанняў, якія цікавяць удзельнікаў семінара, звязаны з крэдытаваннем экспартна-імпартных аперацый ва ўмовах рэфармавання эканомікі. У рабоце семінара ўдзельнічаюць таксама прадстаўнікі Савета Міністраў і Дзяржаўнага Камітэта па знешніх эканамічных сувязях Беларусі.

ПАСМЯЁМСЯ, АДПАЧНЁМ

Для аматараў літаратуры і мастацтва 10 снежня, у пятніцу, у Доме літаратара (вуліца Фрунзе, 5) адбудзецца творчая вечарына сатырыка-гумарыста Міколы Вяршыніна — прэзентацыя яго новай кнігі «Свой чалавек». У ёй прымуць удзел гарадскі тэатр гумару «Плюс — мінус», народны тэатр эстрадных мініяцюр пры Палацы культуры Мінскага трактарнага завода «Карусель» — лаўрэат рэспубліканскіх фестываляў, фальклорны гурт «Фэст», славутыя спевакі Надзея Мікуліч, Алег Атаманаў, а таксама Надзея Ярошына, вядомыя пісьменнікі.

Вечарыну будзе асвятляць тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь.

Пачатак у 18 гадзін 30 хвілін.

Прыходзьце — і вы не засумуеце.

ПАСТАНОВА

САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ № 286

Аб павышэнні заработнай платы педагагічным работнікам, прафесарска-выкладчыцкаму саставу, а таксама асобным катэгорыям работнікаў аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння, навукі, фізкультуры і спорту, культуры і мастацтва.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Павысіць з 1 снежня 1993 г. заработную плату педагагічным работнікам, у тым ліку прафесарска-выкладчыцкаму саставу, а таксама асобным катэгорыям работнікаў аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння, навукі, фізкультуры і спорту, культуры і мастацтва шляхам павышэння іх тарыфікацыі на адзін-два разрады.

Даручыць Дзяржаўнаму камітэту Рэспублікі Беларусь па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва па ўзгадненню з Міністэрствам фінансаў унесці змяненні ў Пастанову Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва ад 21 студзеня 1992 г. № 6.

2. Ажыццявіць у снежні 1993 г. кампенсацыйныя выплаты студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесійна-тэхнічных вучылішчаў з тэрмінам навучання да 10 месяцаў у размеры 5000 рублёў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

3. Устанавіць з 1 студзеня 1994 г. работнікам з вучонай ступенню доктара навук, асноўным месцам работы якіх з'яўляюцца арганізацыі навукі, адукацыі і аховы здароўя, што фінансуюцца за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту, штомесячныя даплаты ў размеры трох мінімальных заработных плат, незалежна ад займаемай пасады. Указаныя даплаты праводзіць па асноўнаму месцу работы.

4. Міністэрству фінансаў унесці прапановы аб парадку прадастаўлення ў 1994 годзе падатковых ільгот установам і арганізацыям адукацыі, аховы здароўя і іншых галін бюджэтнай сферы.

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В.Кебіч.

Кіраўнік спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М.Каўко.

7 снежня 1993 г. г.Мінск.

ДЗЕЛАВЫ МІНСК



З'ЯВІЛАСЯ ПЕРШАЯ ЁЛКА



...Першыя ў нашым горадзе святочна ўбраныя ёлкі з'явіліся і зазіхацелі агеньчыкамі ўжо ўчора на выставе «Калядныя святкі».

Самае доўгачаканае ў дзяцей свята, безумоўна, Новы год. Ды і дарослыя, недзе ў глыбіні душы, таксама чакаюць яго. Засталося ж чакаць зусім мала.

Знайсці святочны падарунак на любы густ можна на выставе «Калядныя святкі», якая ўчора пачалася ў Рэспубліканскім выставачным цэнтры (вул. Я.Купалы, 27). Тут больш за 50 фірм з розных краін прадстаўляюць з дапамогай Дзяржкамітэта па знешнеэканамічных сувязях Беларусі адзенне, абутак, біжутэрыю, бытавую тэхніку, вядома ж — разнастайныя цацкі для малых і ўпрыгожвання ёлкі. Багаты выбар прадуктаў і напояў да святочнага стала (кандытарскіх вырабаў, шакаладу, цукерак, він, шампанскага).

НА ЗДЫМКАХ: урачыстае адкрыццё выставы; для святочнага стала, для Навагодняга балю, у падарунак дзецям.

Міхаіл ВАЛЬКОЎСКІ, «ДВ».
Фота Юрыя ЗАХАРАВА, «ДВ».

ТЭМА ДНЯ

«ЗАЯЦ» СПАЧАТКУ ПАВІНЕН АЧУНЯЦЬ...

Шлях да аб'яднання грашовых сістэм Беларусі і Расіі ляжыць праз стабілізацыю курса беларускай валюты. Гэта пацвердзіў, выступаючы на 13-й сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі старшыня Нацыянальнага банка Станіслаў Багданкевіч. Паводле яго слоў, праблема ў тым, што разліковы білет Нацыянальнага банка Беларусі сёння «слабаваты». Дадатковымі ўмовамі аб'яднання з'яўляецца ўстанаўленне роўных цэн на сыравіну і энерганосьбіты, збліжэнне абменных курсаў грашовых адзінак дзвюх краін.

Як заявіў С.Багданкевіч, ва ўрад Беларусі перададзены распрацаваныя Нацыянальным банкам асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі рэспублікі на 1994 год. Плануецца, у прыватнасці, ажыццяўленне комплексу мер па ўмацаванню плацежаздольнасці беларускага рубля, па скарачэнню да канца года тэмпаў інфляцыі да 3-5 працэнтаў, па стабілізацыі беларускай грашовай адзінкі і збліжэнню яе курса з курсам расійскага рубля. С.Багданкевіч прапанаваў таксама абмеркаваць пытанне функцыянавання разліковых білетаў Нацыянальнага банка адначасова з разглядам эканамічнай праграмы ўрада на 1994 год і прызнаць на пераходны перыяд беларускі рубель адзіным законным плацежным сродкам на тэрыторыі рэспублікі.

Алесь КНЯЗЮК, БелаПАН.

КАЛЯНДАР

СОНЦА — 8.15/15.49.
Даўжыня дня — 7.33.
МЕСЯЦ — апошняя квадра 6 снежня, усход 2.18/заход 12.12.

ІМЯНІНЫ

Сёння:

Праваслаўныя — Аліпія, Інакенція, Якава.

Каталіцкія — Вяслава, Леакадзіі.

Заўтра:

Праваслаўныя — Паладзія, Рамана, Якава.

Каталіцкія — Багдана, Марыі, Рыгора, Юліі.

ПАРТАКТЫЎ

ПРАБЛЕМЫ АДНОЛЬКАВЫЯ. ЖАНЧЫНЫ РОЗНЫЯ?

На днях у Вільнюсе адбылася канферэнцыя «Жанчына і сям'я». Па запрашэнню Літоўскай арганізацыі жанчын удзел у ёй прыняла старшыня жаночага Хрысціянска-дэмакратычнага руху Беларусі Людміла Пеціна.

Як адзначыла Людміла Сымонаўна, праблемы ў Беларусі і Літвы амаль аднолькавыя: смяротнасць перавышае нараджальнасць, павялічваецца колькасць дзяцей у дзіцячых дамах, састарэлых у інтэрнатах, паглыбляецца крызіс сям'і.

Статыстыка, бясспрэчна, сумная. Але жанчыны Літвы не апускаюць рукі. У краіне зарэгістравана 18 жаночых арганізацый, 40 — без права юрыдычнай асобы ў складзе грамадскіх фарміраванняў. Яны распрацавалі шмат праграм па становішчу жанчыны, стварылі цэнтр падтрымкі жанчын, атрымаўшы пад яго фінансавыя сродкі аднаго з германскіх фондаў.

... Сапраўды, праблемы ў Літвы і Беларусі аднолькавыя. Жанчыны — розныя. Нашы сяброўкі з суседняй краіны зразумелі: агульны дом трымаецца на жанчыне, маці. Так было, ёсць, будзе. Мы пакуль спадзяёмся, што праблемы нашы вырашыць добры дзядзька з Саўміна ці Вярхоўнага Савета. Зрэшты, можа я памыляюся.

СУД ЗАПАТРАБАВАЎ ПЕРАКЛАДЧЫКА

7 снежня ў ваенным судзе Мінскага гарнізона пачалося слуханне справы па іску Старшыні Беларускага згуртавання вайскоўцаў Мікалая Статкевіча да Міністэрства абароны і Мінскай вышэйшай ваенна-інжынернай вучэльні з нагоды, як лічыць падпалкоўнік Статкевіч, незаконнага звальнення яго з войску. Суд у складзе палкоўніка юстыцыі Аляксандра Гоціна, засядацеляў падпалкоўніка Ігара Куракіна і маёра Міхаіла Грышкевіча вымушаны быў перанесці пасяджэнне. Падпалкоўніка Статкевіча папрасілі прадаставіць дадатковыя дакументы. Ну, а сам суд запатрабаваў перакладчыка... (не, паважаныя чытачы, не з англійскай) з беларускай мовы.

— Калі ўзнікаюць цяжкасці с судавытворчасцю, я не супраць размаўляць па-расейску, — адзначыў падпалкоўнік Статкевіч. Гатоў на гэты конт нават звярнуцца да шаноўнага суддзі з афіцыйнай заявай. Але, як кажуць, суду відней.

Чарговае пасяджэнне прызначана на 14 снежня. Мяркую, перакладчык будзе знойдзены. Ну, а шаноўным спадарам суддзям і засядацелям варта параіць: вучыце беларускую мову — дзяржаўную мову суверэннай краіны.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, «ДВ».

ГЭТА ФАКТ

ЗА ШТО КДБ НЕ ЛЮБІЎ М.ТУНА

БелаПАН паведамляў ужо аб прыбыцці ў Мінск амерыканскай дэлегацыі, у складзе якой кангрэсмены і іншыя высокапастаўленыя чыноўнікі ЗША. Узначальвае дэлегацыю пасол па асобых даручэннях Малкам Тун. Ён жа з'яўляецца сустаршынёй расійска-амерыканскай камісіі па высвятленню лёсу амерыканскіх ваеннапалонных і прапаўшых без вестак.

Паводле звестак, якія мае БелаПАН, М.Тун нарадзіўся ў 1916 годзе ў Нью-Йорку, па нацыянальнасці яўрэй. Валодае некалькімі мовамі, у тым ліку і рускай. М.Тун уваходзіў у лік лепшых спецыялістаў па СССР. З 1976 па 1979 гады быў паслом ЗША у СССР. Заўзяты антыкамуніст, вядомы сваёй крытыкай кіраўніцтва Савецкага Саюза. Відаць, таму саюзныя спецслужбы праявілі да Туна ўласцівую ім цікаўнасць, падазраючы яго ў супрацоўніцтве з ЦРУ. Але, як кажуць, «аб'ект у кампраметуючых сувязях заўважаны не быў».

З 1992 года М.Тун з'яўляецца сустаршынёй расійска-амерыканскай камісіі па высвятленню лёсу амерыканскіх вайскоўцаў і прапаўшых без вестак. Паводле яго слоў, на гэтую пасаду яго рэкамендаваў экс-прэзідэнт ЗША Дж.Буш. Наколькі вядома, асобых вынікаў у вышэйназванай камісіі няма. Звесткі аб амерыканскіх вайскоўцах, якія нібыта знаходзіліся ў лагерах ГУЛАГа, дакументальна не пацверджаны ні амерыканскім, ні расійскім бакамі. Малаверагодна, што ў Беларусі амерыканцам пашанцуе больш. Аднак чаго ў жыцці не бывае. У любым выніку, можна пазайздросціць амерыканцам, якія і праз многія дзесяткі гадоў працягваюць высвятляць лёс сваіх грамадзян, якія не вярнуліся з вайны.

Максім ТРАПЕЗНІКАЎ.

КАКАЯ ПРОГРАММА ЛУЧШЕ?

Созданная четыре года назад Ассоциация бухгалтеров Республики Беларусь занимается привлечением экономистов, финансистов, бухгалтеров-практиков к активному решению проблем бухгалтерского учета, аудита, созданию методической базы в соответствии с международными стандартами. Такие задачи особенно актуальны для нашей республики, которая не занималась научно-исследовательской деятельностью в этой области за ненадобностью: все указания поступали из Москвы.

Сегодня законы настолько разрозненны, изменчивы, противоречивы, подзаконные акты часто полностью выхолащивают суть основных положений, что бухгалтерам все труднее ориентироваться в запутанной системе налогообложения и другой документации.

Именно поэтому БелАБ участвует в разработке основных нормативных документов, например, Закона Республики Беларусь о бухгалтерском учете, который обсуждается на сессии Верховного Совета.

Кроме этого, ассоциация готовит бухгалтеров для предприятий малого бизнеса, оказывает помощь начинающим специалистам в составлении балансов, приобретении первичной документации, проводит семинары, организует консультации.

— Кстати, мы вместе с Фондом информатизации организовали конкурс бухгалтерских программ, — говорит исполнительный директор Ассоциации бухгалтеров Иван Кравцов. — 15 декабря будут приняты последние заявки от участников. Для желающих присоединиться еще есть время. Звоните нам: 49-21-32. Итоги же будут подведены в начале января будущего года.

Познакомиться с результатами конкурса, новыми идеями и программами можно будет в ассоциации, расположившейся в Белорусском государственном экономическом университете.

КУРС ОБМЕНА наличной валюты в обменных пунктах коммерческих банков г.Минска и официальный курс, установленный Национальным банком на 9 декабря 1993 года

Наименование банка	Доллар США			Немецкая марка			Российский рубль	
	Покупка		Продажа	Покупка		Продажа	Покупка	Продажа
	Наличный расчет	Чековая книжка		Наличный расчет	Чековая книжка			
АРКБ "Комплекс"	4950	5445 6400	5200	2905	3200 3525	3055	3.60	3.80
АКБ "Белвнешэкономбанк	4650	5150	5150	2731	3004	3024	3.50	3.85
АКБ "Белорусский народный банк"	4900	---	5350	2860	---	3100	3.50	---
АКБ "Белпромстройбанк"	---	* *	---	---	* *	---	---	---
АКБ "Беларусь"	5205	6160	---	3009	3560	---	---	4.50
ГКБ " Сбербанк"	4955	5445	5450	2910	3195	3200	3.60	3.95
АКБ "Приорбанк" (на 8.12.93)	4950	5440	5200	2900	3160	3055	3.50	4.50
КБ "ПРОФБАНК"	---	---	---	---	---	---	3.50	---
АКБ "Белбизнесбанк"	5150	* *	5400	2920	* *	3180	3.90	4.20
Национальный банк РБ	7775.00			4566.82			4.15	

** -- не принимают

Информация (на 9 час. 45 мин.) подготовлена "Агентством Гревцова".

ЭКОНОМИКА И ВЛАСТЬ

ИНВЕСТОРЫ НА ЧЕМОДАНАХ НЕ СИДЯТ...

Михаил ВАЛЬКОВСКИЙ, «ДВ».

Международный семинар «Проблемы инвестиций и внешнеэкономической деятельности» прошел в первый день зимы в Минске. Среди организаторов — инновационный Форум Средней и Восточной Европы, Белорусский союз предпринимателей и арендаторов, компания «Экспосервис», Институт Литва — Европа.

Продолжался разговор, начатый днем раньше на конференции в Вильнюсе. В него включились руководители министерств и ведомств Беларуси, многие деловые люди нашей республики и стран Балтии, представители международных финансовых организаций. Были здесь и западные консультанты, имеющие большой практический опыт, помогавшие успешно вкладывать средства в различных отраслях в разных странах.

О взглядах нашего правительства на сегодняшний кризис, о намечаемых мерах по выходу из него рассказал заместитель Председателя Совета Министров Беларуси С.С.Линг. Наверное, для зарубежных участников цифры, характеризующие глубину нашего кризиса, были новыми, но белорусским они уже хорошо известны, так же как и причины такого положения.

Что предлагается для спасения? Отметим снижение на 22 процента налогового бремени на производителей, введение в действие закона о банкротстве, административные меры по усилению дисциплины поставок, контроль над зарплатой (увязка с результатами труда), увеличение экспортных возможностей и изменение принципа формирования валютного фонда. Но, по мнению С.С.Линга, без ускорения системных рыночных реформ и антиинфляционных мер в условиях монополизма предприятий монетаристские меры не дадут эффекта.

Президент инновационного Форума Центральной и Восточной Европы Казимира Прунскене говорила о становлении новых структур и предприятий, приспособленных к рыночным отношениям, о литовском опыте в этой области. Все-таки у наших соседей создано больше предпосылок, привлекающих иностранные инвестиции. В Литве западные бизнесмены имеют возможность свободно вывозить прибыль, арендовать землю на 99 лет, они на 70 процентов освобождены от налога с оборота. Однако даже это не позволило добиться желаемого притока капиталовложений в народное хозяйство Литвы.

В свою очередь заместитель директора НИЭИ Госэкономплана Н.П.Зайченко рассказал о национальных программах привлечения иностранных инвестиций в Беларусь. Он признал, что прямые (от частных инвесторов и фирм) инвестиции в республику почти не попадают.

В основном речь идет о кредитах от иностранных правительств. Они используются на закупку продовольствия, запчастей, сырья и существенно не влияют на выход республики из кризиса. Но эти кредиты снижают показатель кредитной безопасности, поэтому впредь отбор проектов для внешнего кредитования должен быть более жестким. Исходя из мирового опыта Николай Петрович проанализировал условия для привлечения иностранных инвестиций в Беларусь. Похвастаться нечем: соответствующий закон далек от совершенства. Не предусмотрен ряд важных форм, таких, например, когда инвестор вкладывает ценные бумаги. Следует упростить доступ инвестора в страну, процедуру создания предприятий. Конечно же, не стимулирует инвестиции и отсутствие права приобретать землю под зданиями, предприятиями в собственность. Далеки от международных стандартов наши банки и страховые компании, прочая инфраструктура. Видимо, придется допустить иностранный капитал к процессу приватизации, создать ему благоприятный климат за счет налоговых и таможенных льгот. А еще, по примеру соседних стран, необходимо Агентство по иностранным инвестициям.

Надо полагать, что иностранные инвесторы, узнав о такой программе, уже начнут паковать чемоданы и оформлять документы...

Однако член Сейма Литовской Республики К.Антанавичюс не видит перспектив в привлечении инвесторов из-за рубежа. По его мнению, количество СКВ у литовцев вполне соизмеримо с ожидаемыми внешними инвестициями. Однако ни литовцы, ни граждане иных государств не торопятся вкладывать свои деньги в долгосрочные и среднесрочные проекты — все еще помнят, как легко и непринужденно проходила национализация. А без инвестиций невозможно идти вперед. Инвестиции — это будущее, это развитие экономики.

Внешнеэкономическая деятельность белорусских предприятий и фирм идет ни шатко, ни валко: экспорт падает. Импорт — растет, причем за счет использования зарубежных кредитов. Следовательно, растет и внешний долг. Ожидается, что к Новому году он достигнет 640 млн. долларов. Лимит же, установленный Верховным Советом — 700 млн. долларов.

Представители международных финансовых организаций (в частности, Европейского Банка Реконструкции и Развития), некоторые эксперты проводили параллели с Германией 1945 года, задачами, решаемыми ФРГ при объединении.

Конечно же, при всей внешней схожести в бывших советских республиках ситуации абсолютно иные. Они весьма разнятся даже в соседних Литве и Беларуси. Но задача — найти средства для развития народного хозяйства — общая для наших стран.

НАУКА И ТЕХНИКА

ЭЛЕКТРОНИКА — ДЛЯ БЕЗОПАСНОСТИ И УСПЕХА

Галина ШАРАЕВА.

Современные информационные и банковские технологии, программные и технические средства, новые компьютеры и прочее представил минский НИИ ЭВМ на экспозиции «Современный офис и банк» с 30 ноября по 3 декабря.

Одна из новинок — комплексная система безопасности «Щит». Она предназначена для охраны банков и офисов, но может применяться и более широко. Например, в аэропортах, на заводах, в воинских частях, в телецентрах, а если кто-нибудь вздумает, то и в частных домах. Вся оперативная информация в системе сведена на пульт управления, оборудованный персональной ЭВМ, телевизионными мониторами и приборами охранной сигнализации. В комплект могут включаться самые разные устройства — электронные карточки-пропуска, кодовые замки, поворотные турникеты, телевизионные системы наблюдения и др.

Это первый подобный комплекс в странах СНГ. Он дешевле зарубежных и очень удобен в пользовании (поэтому вызвал большой интерес на выставке).

Не меньше приковывала к себе внимание и персональная ЭВМ AS/400 из серии машин IBM. Выставленная НИИ ЭВМ совместно с американо-белорусским предприятием IBA, она создана для комплексной автоматизации банков, бирж, офисов отдельных фирм и учреждений. Эта мощная многопользовательская система, которых пока нет на рынке Беларуси, приходит на смену настольным ПЭВМ и компьютерным сетям. Ее можно использовать также в учебных центрах, в медицине, в страховом деле — везде, где обрабатывается большое количество информации.

С помощью современных процессоров система может расширить свои возможности и работать в глобальных вычислительных сетях. К тому же она сосредоточена в одном блоке и в ней применимы многие программные средства. Все это по достоинству оценили во время выставки профессионалы, применяющие вычислительную технику в мире бизнеса.

Я ВАМ ПИШУ

ВМЕСТО РАКЕТ — МУСОРНЫЕ АВТОМАТЫ

Александр ДИСКО.

Еще в недалеком прошлом гости столицы, да и мы, горожане, восхищались чистотой, порядком нашего Минска. Каким-то образом это все поддерживалось. Сейчас же улицы, площади города заполнились мусором. И никому до этого дела нет, даже санитарной службе.

А вот что рассказал мой знакомый, который возвратился недавно из поездки во Францию. Он был поражен чистотой улиц городов. Нигде ни соринки, ни бумажки. Идешь по тротуару, как по паркету. Как же жителям этой страны удается поддерживать такой порядок? Оказывается, с помощью мусор-автоматов. Они установлены чуть ли не на каждом шагу. Автоматы «собирают» бутылки, ненужные бумажные пакеты, коробки из-под продуктов и промтоваров, прочий бытовой мусор. Выпил, скажем, на улице бутылку колы и тут же можешь «сдать» ее автомату. Умная машина заплатит за нее монетой. Вознаграждение автоматы дают не только за стеклотару, но и за макулатуру, за использованные пластиковые стаканчики. С выдачей монет одновременно включается пресс, который сплющивает мусор и отправляет его в бункер-накопитель. Применение таких автоматов позволяет утилизировать бумагу, пластик, тряпки.

Наши предприятия тоже могли бы выпускать такие автоматы. Разве «оборонке», оказавшейся сейчас не у дел, они не по силам? Тройная польза была бы от этого: заводчане не маялись бы без работы, экономилось бы ценное сырье благодаря вторичному использованию отходов, да и город наш не был бы похож на помойку. Согласитесь, когда знаешь, что за стаканчик из-под мороженого или за молочный пакет ты получишь деньги, сорить этим не захочется.

ГЭТА ФАКТ

ЧАЦВЁРА СМЕЛЫХ

На сённяшні дзень усяго чатыры прадпрыемствы транспартнага комплексу Беларусі змянілі форму ўласнасці. Практычна завершана работа па прыватызацыі яшчэ ў трох.

У адпаведнасці з урадавай праграмай і рэкамендацыямі спецыялістаў Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця, грузавы аўтатранспарт падлягае прыватызацыі ў першую чаргу. Аднак гэты працэс ідзе марудна. Прычына таму — вялізныя фінансавыя цяжкасці прадпрыемстваў. З-за невераготнага росту цэн на паліва і запчасткі многія аўтапаркі рэспублікі апынуліся літаральна на мяжы спынення. Тармозіць прыватызацыю і маўклівае, а дзенідзе і адкрытае супраціўленне ёй у абласных упраўленнях аўтамабільнага транспарту.

Тым не менш, на фоне агульнага спаду ў дзяржаўным сектары транспартнай галіны прыватызаваныя працоўнымі калектывамі «Мінскінтэртранс», мінскі таксапарк № 2, брэсцкае аўтамабільнае транспартна-экспедыцыйнае прадпрыемства № 1 і Гомельскі электратэхнічны завод адчуваюць сябе ўпэўнена і нічога не просяць ва ўрада.

Ірына СЯРОГІНА.

В ГОРОДАХ БЕЛАРУСИ



Хороший подарок получили жители одного из густонаселенных районов Витебска — Первомайского. Здесь в строй действующих вступила новая детская поликлиника. В небольшом двухэтажном особняке разместились приемный покой, кабинеты врачей, процедурные.

НА СНИМКЕ: новая детская поликлиника.

Фото Александра ХИТРОВА, БЕЛИНФОРМ.

РЭСПУБЛІКА

СХОВІШЧА — НА КАНСЕРВАЦЫЮ

Непатрэбным аказалася выслабаненае сховішча для ядзерных боепрыпасаў пад Бабруйскам. Гэты унікальны комплекс збудаванняў перадало гораду Міністэрства абароны рэспублікі. Усе падземныя і надземныя памяшканні ў ім зроблены сумленна і на вякі, а асобныя з іх разлічаны нават на аўтаномнае жыццё. Усюды — высокі ўзровень механізацыі і аўтаматызацыі. Апрача сховішча яшчэ казарма, клуб, сталовая, лазня, кацельня, іншыя тэхнічныя і гаспадарчыя збудаванні. Ёсць нават свой стадыён. І ўсё гэта быццам з неба звалілася і бясплатна.

Але, на жаль, сапраўды царскі падарунак гораду не пад сілу прыняць ва ўмовах цяперашняй эканамічнай разрухі і беднасці. Ні камунгас, ні гандлёвыя і іншыя арганізацыі, ні прамысловыя і спартыўныя таварыствы не згадзіліся выкарыстоўваць гэты комплекс з-за велізарных затрат на ўтрыманне і аддаленасці ад горада. Нават вынаходлівыя камерсанты і прадпрымальнікі не асмеліліся ўзяць яго ў арэнду. Унікальнае абароннае збудаванне так і не атрымала цывільнай прапіскі: пастаўлена на кансервацыю да лепшага часу.

І СВАІМ ПЕРАПАДЗЕ

Адразу 35 новых мадэляў трыкатажных вырабаў было прадстаўлена на прагляд мастацка-тэхнічнага савета ў пінскім гандлёва-прамысловым аб'яднанні «Палессе». Касцюмы, жакеты, світэры вызначаюцца шырокай гамай расфарбовак і фасонаў. Некаторыя з іх выканаш па заказах зарубежных фірм. Плануецца, што ўжо ў наступным годзе ўсе навінкі будуць запушчаны ў вытворчасць і паявяцца на прылаўках беларускіх магазінаў.

ЗАМЕСТ КУХОННАГА РАДЫЁ

Перасталі карыстацца праводным радыёвяшчаннем жыхары Падароска, Войткавічаў, Канюхоў і іншых вёсак Ваўкавыскага раёна. Узамен яго ў мясцовых дамах загаварылі трохпраграмныя радыёпрыёмнікі «Гародня», якія выпускаюцца адным з гродзенскіх прадпрыемстваў і сілкуюцца ад электрасеткі. Маламаёмным сем'ям элегантны прыёмнік, замест прывычнага кухоннага, падарылі мясцовыя гаспадаркі.

Ходзяць чуткі, што з цягам часу ад традыцыйнага правадного радыё адмовяцца і іншыя населеныя пункты раёна.

«МАРЫЛЯ» ЖАДАЕ ЗДАРОЎЯ

Менавіта так ласкава назвалі сваю новую прадукцыю работнікі Іванаўскага харчовага завода. З глыбіні 660 метраў яны пачалі здабываць лячэбную мінеральную ваду, якая будзе карысная тым, хто пакутуе ад хвароб страўніка, печані, падагры і цукровага дыябету. Рэканструяваная тэхналагічная лінія здольна выдаваць у суткі каля дзвюх тысяч бутэлек лекавай мінералкі.

ЧЫЁ СВЯТА ЛЕПШАЕ?

У Слонімскім раёне падвялі вынікі агляду-конкурсу ўстаноў культуры на лепшую відовішчную праграму для дзяцей. Лаўры пераможцы дасталіся Бярдовіцкаму сельскаму клубу за адраджэнне старадаўняга народнага свята «Камаедзіца». А яшчэ строгае журы і гледачы высока ацанілі клубныя варыянты «Масленіцы» і «Праводзінаў вясны», «Беларускага кірмашу» і «Купалля».

ПАЛІВАНЫ ЭКСПАРТ

Абліцовачную паліваную плітку пачаў выпускаць камбінат «Магілёўбудматэрыялы». Пакуль асвоены першыя дзве расфарбоўкі, але ўжо ў недалёкай будучыні паліва дапаможа атрымліваць плітку ўсіх колераў вясёлкі і нават «пад мармур». Новы тавар такі хадавы, што заяўкі на набыццё прыгожай пліткі паступілі нават з блізкага і далёкага замежжа. Дарэчы, частку абсталявання для новага цэха не прыйшлося закупляць за мяжой — яго вырабілі на мясцовым заводзе «Строммашына».

БЕЛІНФАРМ.

АКТУАЛЬНО

НА КРЫШЕ ЛИФТА С «ВЕТЕРКОМ»...

Евгений ЗВЕРИНСКИЙ.

В эти дни пустует место за партой в классе средней школы № 154, где обычно сидел Сергей Никончик. Не видно Сергея и среди сверстников во дворе дома № 36, что на проспекте Любимова. Что же произошло с подростком? Он получил тяжелую травму в лифте в своем же подъезде. Происшествие? Да! Но было ли оно случайным? Чтобы скоротать время после уроков в школе, Сергей и его друзья устроили бесцельное катание на лифте. Но не в кабине, а на крыше, чтоб с «ветерком». При движении вверх нога Сергея была зажата между кабиной и деталями, расположенными в шахте. Итог — перелом. К счастью, сработало одно из блокировочно-предохранительных устройств и лифт остановился. Иначе не избежать трагедии.

Что это: детская шалость, «ЧП»? Думаю, хулиганство. При осмотре лифта после происшедшего обнаружено, что крыша кабины и нижняя часть шахты были покрыты листами картона: чтобы мягче было «путешествовать». Значит, не впервой устраивались подобные игры. А может, это даже не игра... По сведениям работников лифторемонтной службы, из лифта в этом же подъезде дважды были похищены динамики переговорной связи. Не было ли это еще одной попыткой обзавестись громкоговорителем?

Случаи проникновения подростков в лифтовые шахты наблюдались и в домах № 7 по ул.Лещинского, № 50 по ул.Тикоцкого, № 26 по ул.Горовца, № 13 по проспекту Пушкина, № 24 по ул.Первомайской, № 74 по ул.Ольшевского и других. В большинстве своем они привели к тяжелым травмам школьников и одному смертельному исходу.

Каждый лифт буквально «напичкан» множеством предохранительных и блокировочных программ. Есть и устройство, прерывающее работу в случае проникновения в шахту посторонних лиц. Однако наши дети настолько грамотны, что научились обманывать автоматику.

Важную роль в сохранности лифтового оборудования и соблюдения правил безопасности должна сыграть разъяснительная работа среди детей. К сожалению, она практикуется редко. Работники ЖРЭО, ЖЭСов перестали бывать в школах.

Хочется обратиться к родителям, всем взрослым: возьмите на себя контроль за работой лифтов в подъездах, предупредите о последствиях своих детей.

ВАЧЫМА МАСТАКА



Мал. Я.БУСЛА.

РЭЗАНАНС

«УТКИ» ОСЕНЬЮ В БОЛЬШОЙ ЦЕНЕ

Майор С.Верещак. Лейтенант А.Качура.
Информационный центр МВВКУ.

Казалось, после известной поправки к статье 6 части 2 «О статусе военнослужащих» все расставлено на свои места. Напомню, суть ее в том, что военнослужащие не связаны решениями политических партий, массовых общественных движений и не могут заниматься общественно-политической деятельностью. Кроме этого, Министерство обороны неоднократно заявляло: в рядах Вооруженных сил нет и быть не может членов политических партий или организаций. И верно, ведь те, кто в свое время не согласился ограничить свою служебную деятельность лишь выполнением должностных обязанностей и пытался влиять на политическую ситуацию в республике, были уволены из армии.

Но нет-нет да и появится в средствах массовой информации сообщение о военнослужащих, якобы продолжающих политическую деятельность. Понятно, информация в итоге оказывается «уткой». Но дело сделано — читателю подброшено сомнение. К сожалению, здесь вина не только авторов, чаще всего скрывающихся под вымышленными именами, но и тех, кто готовит материал к печати. Сказывается некомпетентность, стремление выплеснуть на страницы газеты жареные факты, а самим спрятаться за строками: «Авторы опубликованных материалов несут ответственность за подбор и достоверность фактов, их взгляды не обязательно отражают позицию редакции», что, как правило, помещены в конце номера любой газеты.

К числу подобных публикаций можно отнести и статью «Инцидент на площади» («Добры вечар», 27.09.1993 г.). Ее автор — Павел Романов — представился курсантом Минского высшего военного командного училища и членом Беларускага згуртавання вайскоўцаў.

С первых же строк повествования Романова в глаза бросаются натяжки (уж в редакции газеты-то должны были обратить на них внимание!). Время обучения в МВВКУ 4 года. Как же в его стенах в сентябре нынешнего года мог оказаться курсант, который в строю первокурсников принимал военную присягу аж 3.09.89 г.? Нетрудно подсчитать, что в настоящее время он должен носить офицерские погоны. «Может, он второгодник?» — спросит неискушенный читатель. История военных училищ еще не знает случая, чтобы курсант по каким-либо причинам был оставлен на второй год. Академотпуска им не предоставляются, а о декретных отпусках и речи быть не может.

Но и это еще не все. На самом деле курсанта П.Романова в МВВКУ нет. Нет такой фамилии и среди отчисленных из училища. Могли все это уточнить в редакции (материал-то ведь не рядовой!)? Конечно. Для этого нужен всего лишь один телефонный звонок.

О второй же части послужного списка курсанта Павла Романова — его членстве в БЗВ — после всего этого говорить даже излишне. Не могут же в БЗВ числиться призраки...

Но оставим автора (или псевдо-автора — это уж как вам угодно) в покое. Поговорим о самом материале.

События, произошедшие 5 сентября, автор изложил правдиво, да вот только с их обоснованием позвольте не согласиться. С большим трудом верится, что пришли в то дождливое воскресное утро члены «Задзіночаньня беларускіх студэнтаў» для того, чтобы поздравить курсантов с принятием воинской присяги. Никак не ощутили на себе их знаков внимания будущие офицеры. Все то недолгое время, которое члены ЗБС находились на площади Независимости, они посвятили позированию корреспондентам (и блистали плакаты во всей красе!) и препиранию с милицией. Кстати, автор скромно умалчивает, что именно по требованию сотрудников МВД студенты переместились с площади к зданию Минского метрополитена. Прочитать статью, так складывается впечатление, что не успели бедные студенты развернуть транспаранты, как солдаты оцепления, озверевшие от холодного дождя, принялись рвать белоснежную материю плакатов на подворотнички.

Но самое главное в этом материале, несомненно, его злободневность. Хоть день-то давно прошел, но злоба осталась. И истоки ее очень легко проследить: несмотря на все старания раздуть из инцидента чуть ли не национальную трагедию, общественное мнение отреагировало на него весьма равнодушно. Белорусы, больше озабоченные завтрашним днем, вяло реагируют на шовинистические, пардон, националистические призывы, что вселяет определенный оптимизм и уверенность в неповторении в Минске тбилисских и вильнюсских вариантов.

Ну, что ж, как там у Александра Розенбаума, «но утки уже летят высоко, летать так летать — я им помашу рукой...».

НАШ КАМЕНТАРЫЙ:

КОЛЬКІ СЛОЎ ПРА ЦЭНАВУЮ ПАЛІТЫКУ

Максім ГРЭК.

Каб адразу супакоіць прадстаўнікоў Мінскага вышэйшага ваенна-каманднага вучылішча, паведамлю — у шэрагах сённяшніх курсантаў гэтай установы Паўла Раманава сапраўды няма і ніколі не было. Мы адшукалі аўтара вышэйзгаданага ліста, ён на самай справе носіць іншае прозвішча. Паважаючы і, згодна з Законам аб друку, абараняючы тайну яго псеўданіма, мы не маем магчымасці назваць сапраўднае імя гэтага маладога чалавека і шчыра шкадуем, што падобная недарэчнасць змусіла двух паважаных афіцэраў узяцца за пяро і напісаць у рэдакцыю. З другога боку, мы шчыра шкадуем таксама, што маладыя ваяры (а так званы Павел усё ж вучыўся ў адзначанай установе і атрымаў пагоны лейтэнанта ў мінулым годзе), якія маюць адрозны ад афіцыйнага пункт погляду, вымушаны выказвацца, хаваючыся пад псеўданімам.

Шкадуем мы і з нагоды таго, што грамадска-патрыятычную арганізацыю Згуртаванне беларускіх вайскоўцаў абвясцілі чамусьці палітычнай і звольнілі яе сяброў з вайсковай службы. Тут, вядома, можна было б і паставіць кропку, але, вашымі ж словамі, паважаныя афіцэры, кажучы, пакінем аўтара ў спакоі і пагаворым пра сам матэрыял, а таксама пра ваш бліскучы адказ.

Трэба валодаць багатай фантазіяй, каб, прачытаўшы допіс П.Раманава (дазвольце і далей называць яго менавіта так), уявіць сабе салдат, якія звярэюць ад дажджу і рвуць плакаты на падкаўнерыкі. Не такія ўжо і звяры нашыя салдаты, спадары афіцэры! Сам служыў, і, далібог, ад кропель вады мы не вар'яцелі і не кідаліся на цывільных грамадзян. А на падкаўнерыкі абсалютна хапала таго, што прадавалася ў салдацкім магазіне. І зусім не пра «звярынасць» пісаў спадар Раманаў.

